**КАТЭ́ДЖ** (англ. cottage першапачаткова — сялянскі дом), драўляны, каменны або мураваны індывід. жылы дом сядзібнага тыпу, часцей 2-павярховы. Уключае разнастайны набор памяшканняў: на 1-м паверсе звычайна размяшчаюцца гасціная, кухня, сталовая, на 2-м — спальныя пакоі; часам мае гараж для аўтамабіляў (падземны ўзровень). К. будуюцца на прыгарадных тэр. блізка ад шашы, у сельскай мясцовасці, курортных зонах, гар. асяроддзі. Групы К. утвараюць пасёлкі. Узводзяцца па тыпавых і індывід. праектах. У архітэктуры Беларусі К. як тып жылога дома атрымаў распаўсюджанне з канца 1980-х гг. Пад уплывам постмадэрну аблічча сучасных К. Беларусі вызначыла рэтраспектыўная тэндэнцыя. Пашырэнне атрымалі гіст. матывы сярэдневяковых абарончых збудаванняў раманскага стылю, барока, класіцызму, мадэрну (забудова вул. Філімонава ў Мінску, пасёлкаў Баравая, Бараўляны, Гарадзішча, Навінкі Мінскага р-на, па вул. Філімонава ў Мінску).

*Ю.Ю.Захарына.*



*Сучасны катэдж.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ